# Урок беларускай літаратуры
# «Уладзімір Караткевіч «Дзікае паляванне караля Стаха». Маральна-этычныя і духоўныя праблемы ў аповесці» (9 клас)

**Т. П. Баранкевіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
гімназіі г. Іванава

Прыём SWOT-аналіз выкарыстоўваецца для аб'ектыўнай ацэнкі моцных і слабых бакоў дзейнасці, дапамагае высветліць недахопы і знайсці шляхі да іх рашэння. Выкарыстоўваецца SWOT-матрыца, якая змяшчае моцныя і слабыя бакі, а таксама магчымасці і пагрозы.

Метад мазгавога штурму з'яўляецца адным са спосабаў пошуку новых ідэй. Гэта адзін з найбольш папулярных метадаў стымулявання творчай актыўнасці. Дзякуючы мазгавому штурму, вучні хутка ўключаюцца ў працу, стымулюецца творчая актыўнасць, фармуецца здольнасць канцэнтраваць увагу і разумовыя намаганні. Пры гэтым вучні вучацца сцісла і максімальна выразна выказваць свае думкі, аналізаваць іх.

Выкарыстанне метадаў стратэгіі форсайта ажыццяўляецца на этапе вывучэння новага матэрыялу. Метад «мазгавы штурм» накіраваны на работу з такой часткай самаадукацыі вучняў, як здольнасць самастойна фармуліраваць думкі, прапаноўваць асабістыя версіі і аргументаваць іх. Метад SWOT-аналізу з аднаго боку дапамагае вучням прааналізваць паводзіны герояў, а з другога боку выпрацоўваць навыкі параўнальнага аналізу, уменне самастойна ацаніць твор. Дамашняе заданне таксама мяркуецца з прымяненнем метаду SWOT-аналізу, калі вучні самастойна прымяняюць яго пры аналізе мастацкага фільма ў параўнанні з творам.

**Тэма.** Уладзімір Караткевіч «Дзікае паляванне караля Стаха». Маральна-этычныя і духоўныя праблемы ў аповесці (фрагмент урока).

**Мэта:** сфарміраваць уяўленне аб прызначэнні чалавека на зямлі, лёсе беларускага народа на аснове зместу твора.

**Задачы:**

- ❒ спрыяць выхаванню пачуцця нацыянальнай і чалавечай годнасці, засяродзіўшы ўвагу на праблемах дабра і зла, кахання і нянавісці, гераізму і здрады, на агульначалавечым змесце твора;
- ❒ выпрацоўваць здольнасць самастойна фармуліраваць думкі, прапаноўваць асабістыя версіі і аргументаваць іх; выпрацоўваць навыкі параўнальнага аналізу з выкарыстаннем метаду SWOT-аналіз; развіваць звязнае маўленне вучняў;
- ❒ стварыць умовы для прыняцця значымасці авалодання вучэбна-упраўленчай кампетэнтнасцю для рэалізацыі сваіх жыццёвых планаў;
- ❒ садзейнічаць уменню ставіць і рашаць розныя тыпы камунікатыўных задач, вызначаць мэты камунікацыі, ацэньваць сітуацыю і свае магчымасці, улічваць намеры і спосабы камунікацыі партнера, ажыццяўляць самаманіторынг; быць гатовым да асэнсаванага змянення сваіх камунікатыўных паводзін;
- ❒ успрыняцце вопыту эфектыўнай арганізацыі і ўпраўлення ўласнай дзейнасцю як значымай каштоўнасцю і вызначэннем свайго уласнага прафесійнага шляху і месца ў жыцці.

**Тып урока:** вывучэнне новага матэрыялу (з прымяненнем метадаў SWOT-аналізу, мазгавога штурму).

**Абсталяванне:** карткі з віктарынай, SWOT-матрыцы

## Ход урока

**I. Арганізацыйны момант**

**II. Паведамленне тэмы, мэты ўрока**

Праца з эпіграфам (абмеркаванне сутнасці эпіграфа)

> У падзеях мінулага – нашы карані.
> А дрэва без каранёў не можа не
> існаваць, ні, тым больш, прыносіць плады.
>
> Уладзімір Караткевіч

## III. Праверка чытацкага ўспрымання

***Гульня «Пра каго ідзе размова»***

1. «Спіць і бачыць сябе гаспадаром вялізнага замка». *(Дубатоўка.)*

2. Чые гэта словы? «Мазгоў з напарстак, а сківіцы як у дыназаўра, на семсот зубоў. Топчуць маленькіх, прадаюць сумленне». *(Свеціловіч.)*

3. «Пра цябе казалі, што Яноўскую, калі яна сіратой засталася, шкадаваў, нават хацеў вартаўнікам да яе перайсці». *(Селянін Рыгор.)*

4. «Абкладзеная з усіх бакоў, яна не страціла лепшых сваіх якасцей: спагадлівасць, дабрыню, самаахвярнасць». *(Яноўская Надзея.)*

5. «Мая гордасць – маё адзінае, я не даю нікому наступіць сабу на нагу». *(Беларэцкі.)*

6. Не згаджаўся спачатку забіваць Яноўскую, але пасля з'ўлення Свеціловіча згадзіўся і ён. *(Варона.)*

## IV. Аналітычная гутарка..

– З якім настроем вы чыталі твор? Чым ён вас уразіў?

– Які час паказаны ў творы?

– Што трэба для таго, на думку галоўнага героя, каб мы не зніклі?

– Што ляжыць у аснове сюжэта?

– Хто такі Андрэй Беларэцкі? Адкуль ехаў, куды і з якой мэтай?

– Хто такая Надзея Яноўская? Якое першае ўражанне склалася ў Андрэя Беларэцкага пра Яноўскую? Ці змяніліся погляды?

**Выкарыстанне метаду «Мазгавы штурм»** (праца ў групах, 5 хвілін).

– Важнае месца ў аповесці належыць легендзе пра караля Стаха. Што паказвае гэтай легендай У. Караткевіч? Падумайце над пытаннем і прапануйце некалькі ідэй.

– У чым самабытнасць аповесці? Што больш за ўсё турбавала Уладзіміра Караткевіча?

*(Абарона меркаванняў кожнай групы. Карэкцыя адказаў.)*

**Выкарыстанне метаду SWOT-аналіз** (вучні працуюць з тэкстам твора і запаўняюць табліцы па кожным герoі).

**Андрэй Беларэцкі**

| **Моцныя бакі:** | **Слабыя бакі:** |
|---|---|
| **Магчымасці:** | **Пагрозы:** |

**Прыкладныя адказы:**

| **Моцныя бакі:**<br>Імкнецца захаваць культурную спадчыну продкаў;<br>стараецца дапамагчы Надзеі Яноўскай | **Слабыя бакі:**<br>Пад пагрозай смерці хоча ўсё пакінуць і вярнуцца дадому, не скночыўшы пачатую справу |
|---|---|
| **Магчымасці:**<br>Разгадаць, хто хаваецца пад дзікім паляваннем; даведацца, хто такі Маленькі чалавек і Блакітная жанчына | **Пагрозы:**<br>За дапамогу Надзеі Яноўскай спрабуюць забіць |

**Надзея Яноўская**

| **Моцныя бакі:** | **Слабыя бакі:** |
|---|---|
| **Магчымасці:** | **Пагрозы:** |

**Грыня Дубатоўк**

| **Моцныя бакі:** | **Слабыя бакі:** |
|---|---|
| **Магчымасці:** | **Пагрозы:** |

*(Абарона меркаванняў кожнай групы. Карэкцыя адказаў.)*

**V. Падагульненне. Рэфлексія**

**VI. Дамашняе заданне**

Паглядзець фільм «Дзікае паляванне караля Стаха», адшукаць адрозненні фільма ў параўнанні з мастацкім творам.